# Гісторыя

*А.Ул. ЛЮБЫ*

## ПАЛІТЫЧНЫ КАНФЛІКТ 30-40-х гг. XV ст. У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Рассматриваются термины «восстание Свидригайлы», «феодальная война», «гражданская война» и «борьба» («валка»), характеризующие период 1430-1440-х гг. в истории ВКЛ. Делается вывод о целесообразном использовании термина «внутриполитическая борьба» в литературе, исследующей указанный период.

The terms «Swidrigajla's uprising», «feudal war», «civil war» and «struggle» («walka»), which characterized the period of 1430-1440 -s in the history of the GDL, are considered in the article. The author comes to the conclusion about expedient use of the term «internal political fight» in scientific literature.

Унутрыпалітычная барацьба 1430-1440-х гг. знайшла адлюстраванне ў гістарычнай літаратуры галоўным чынам у сувязі з пытаннямі дзяржаўнай уніі паміж Вялікім княствам Літоўскім (ВКЛ) і Польскім каралеўствам, Падзеі разглядаліся ў кантэксце выбару: быць ці не быць ВКЛ асобнай дзяржавай. Барацьба абвяшчалася ўнутранай справай Княства, але тлумачылася з пазіцыі ўплыву на развіццё міждзяржаўных адносін унутры уніі. Даследчыкі лічылі, што ў аснове канфлікту знаходзілася барацьба за вялікакняжацкі пасад паміж двума прэтэндэнтамі, за якім стаялі палітычныя групоўкі.

Перыяд ад замаху на вялікага князя Свідрыгайлу ў Ашмянах (1 верасня 1432 г.) да смерці Жыгімонта Кейстутавіча (20 сакавіка 1440 г.) уваходзіць у праблемнае поле падзей і разглядаецца навукоўцамі як "грамадзянская вайна" ці "феадальная вайна". Для польскай нацыянальнай гістарыяграфіі канца XIX - пачатку XX ст. характэрным тэрмінам з'яўляецца "паўстанне Свідрыгайлы" (гісторык А. Левіцкі ўвёў яго для вызначэння палітыкі Свідрыгайлы супраць Ягелонскай уніі)[1]. На жаль, такая назва падзей сустракаецца і сёння ў айчыннай літаратуры і з'яўляецца калькай, не тоеснай польскаму сэнсу[2].

Такім чынам, у гістарыяграфіі склаліся два тыпы характарыстыкі падзей 1430-х гг.: "паўстанне" і "вайна". Першы - тлумачыць канфлікт як агрэсію з боку вялікага князя Свідрыгайлы супраць пэўных сацыяльных і палітычных каштоўнасцей як унутры ВКЛ, так і ўнутры уніі. Супраціўленне такой палітыцы замацоўвае "легальнасць" змагання з вялікім князем, што і робіць Жыгімонт разам са сваімі прыхільнікамі. Васалы, дзякуючы буле папы Яўгена IV ад 1 студзеня 1432 г., вызваляліся ад сваёй прысягі вялікаму князю Свідрыгайлу[3], а ўжо ў восень таго ж года кароль Уладзіслаў-Ягайла вызнае вялікім князем літоўскім Жыгімонта Кейстутавіча[4]. Але працэс "паўстання", які, акрамя ўнутрыдзяржаўнага значэння, закранаў і пабудову уніі, разгортваўся ў кірунку кампрамісных змен палітыкі і ўнутры ВКЛ, і ўнутры палітычнай прасторы Кароны і Княства. "Паўстанне" не адлюстроўвае прычыны падзей і праблемы, якія сталі асновай канфлікту, а толькі засяроджвае ўвагу на моманце выбуху і непасрэдных ваенных дзеяннях.

Другі тып вызначэння канфлікту - вайна "феадальная" ці "грамадзянская" - канкрэтызуе ўнутрыпалітычны характар падзей: 1430-я гг., як барацьба ўнутры пануючага класа, ці барацьба, якая закранае ўсе часткі грамадства, вядзе да змен сацыяльных адносін[5]. Унутраная вайна ўплывае на палітычнае становішча дзяржавы на знешнепалітычнай арэне. Наступствы пераўтварэнняў адбіваюцца на паслабленні ці, наадварот, узмацненні дзяржавы як суб'екта міжнароднай палітычнай сістэмы.

Актыўны ўдзел наёмных і саюзных атрадаў у барацьбе вялікакняжацкіх груповак, з аднаго боку, дазваляў сканцэнтраваць ваенныя сілы для вырашэння пастаўленых задач. Так на баку Свідрыгайлы толькі ў бітве пад Вількамірам удзельнічалі, акрамя ўласных атрадаў падданых вялікага князя, рыцары з Інфлянтаў, Сілезіі, Чэхіі, Цвяры[6]. Асноўную ж баяздольную частку войска Жыгімонта складала наёмнае польскае войска[7]. З другога боку, бесперапынная ваенная кампанія паслабляла не толькі эканамічнае становішча зямель, але, дэфармуючы палітычнае становішча дзяржавы, падрывала яе аўтарытэт. Калі на пачатку працы Базельскага сабора ВКЛ разглядалася ў якасці асноўнага пасрэдніка паміж Канстанцінопалем і Заходняй Еўропай, то ўжо да сярэдзіны 1430-х гг. канцылярыя папы Яўгена IV і ўдзельнікі Сабора ставіліся да тэрыторыі дзяржавы не інакш як да рэгіёна, дзе магчыма непасрэдна рэалізаваць царкоўную унію.

У беларускай гістарыяграфіі назва 'феадальная вайна" была выкарыстана для характарыстыкі падзей 30-х гг. XV ст. на пачатку 1990-х гг. поруч з назвай "грамадзянская вайна"[8]. Дадзеная тэрміналогія не была ў поўнай меры асэнсавана аўтарамі і хутчэй падае падыход, звязаны з традыцыяй у гістарыяграфіі, чым пазіцыю аўтара. У савецкай навуковай літаратуры 'феадальнай вайной" называліся ўнутрыдзяржаўныя канфлікты ў Сярэднявеччы, калі барацьба разгорталася ўнутры аднаго класа феадалаў за кантроль над уладай у краіне, менавіта, над сродкамі вытворчасці[9]. "Грамадзянская вайна" - вызначалася міжкласавымі адносінамі і выяўляла сацыяльныя зрухі, змену ў міжкласавых адносінах[10].

У рускай дарэвалюцыйнай навуцы "грамадзянская вайна" характарызавала барацьбу так званых "партый". Спроба адной магутнай партыі надоўга знясіліць другую, выціснуць яе на перыферыю палітычнага жыцця дзяржавы паслужыла бы выклікам да ўзнікнення грамадзянскай вайны[11].

У еўрапейскай літаратуры тэрмін "грамадзянская вайна" ўжываецца ў адносінах да канфліктаў унутры дзяржавы у процівагу міждзяржаўным войнам. "Wojna domowa" - пашыраны ў польскім навуковым звароце, адкуль непасрэдна і трапіў ва ўжытак беларускіх аўтараў.

Тэрміналогія, ужываемая ў літаратуры, відавочна адлюстроўвае ступень асэнсавання падзей 1430-х гг. у гістарычнай навуцы канца XIX - першай трэці XX ст. і ў 1990-я гг. Але ў крыніцах сустракаецца і аўтэнтычны тэрмін, які характарызуе падзеі 1430-х гг. У судовых актах часоў вялікага князя Казіміра выкарыстоўваецца вызначэнне "валка"[12].

Падсумоўваючы крытэрыі характарыстыкі падзей 1430-х гг. у навуковай літаратуры, адзначым, што асноўную ўвагу аўтары звярталі на стасункі паміж прэтэндэнтамі на вялікакняскі пасад і іх пазіцыю па захаванню уніі паміж Польскім каралеўствам і ВКЛ, адносіны ўнутры феадальнага саслоўя, складанне пракняжацкіх "партый". Расійскі гісторык А.Ю. Дварнічэнка паспрабаваў разглядзець ролю і ўплыў "гарадскіх абшчын" на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў дзяржаве[13]. Кожная з адзначаных праблем мае абмежаваны прадмет даследавання і не можа характарызаваць увесь перыяд. Барацьба Свідрыгайлы і Жыгімонта, адносіны да прэтэндэнтаў на вярхоўную ўладу з боку феадалаў, канцэнтрацыя ў варагуючых лагерах прадстаўнікоў набілітэту, розных этнічна і канфесійна, не раскрывав прычын утварэння, як меней, дзвюх партый, а ў канцы перыяду, аб'яднанне іх вакол кандыдатуры каралевіча Казіміра, прадстаўніка польскай дынастыі Ягелонаў. Вылучэнне асобнага становішча гарадоў "рускіх" зямель ВКЛ не ўказвае на пазасаслоўны характар вайны.

У сучаснай літаратуры сустракаюцца аўтарскія пазіцыі-характарыстыкі ўнутрыдзяржаўных працэсаў. Так, навуковец Л.М. Гумілёў паспрабаваў звязаць падзеі палітычнай гісторыі з этнічнымі працэсамі на вызначанай тэрыторыі. Зવы-

чайна акматычная фаза суправаджаецца такімі масавымі забойствамі і ўнутранай барацьбой, што прыпыняе ход этнагенезу. Калі залішняя энергія, якая раней скарыстоўвалася на хуткі рост і экспансію, пачынае пераўтварацца ва ўнутраныя канфлікты, пасіянарны зарад у выніку забойстваў скарачаецца, то этнас пачынае жыць па інерцыі, дзякуючы накопленым матэрыяльным каштоўнасцям. Паступова пасіянарнась знікае, самі пасіянарыі выціскаюцца на перыферыю, на ўскраінныя тэрыторыі, а ў цэнтры пануюць прагматычныя лідэры над законапаслухмянымі падданымі[14]. Такімі па вызначэнню аўтара былі "Вайна ружаў" у Англіі і "Феадальная вайна" ў Вялікім княстве Маскоўскім.

У апошняй трэці XIV ст. адбываецца працэс барацьбы ўнутры пануючай дынастыі Гедымінавічаў. Шэраг князёў - Андрэй Альгердавіч, Уладзімір Альгердавіч, Вітаўт Кейстутавіч, нарэшце малады Свідрыгайла Альгердавіч - выступаюць супраць улады вялікага князя літоўскага. Асноўную падтрымку яны знаходзяць у сваіх землях-удзелах, сярод феадалаў і ў гарадах. Апошнія, па словах М.К. Любаўскага, былі зацікаўлены ў спусташэнні свайго суседа. Ваенныя паходы працягваюцца, але яны скіраваны не на заваяванне вонкавых зямель і ўсталяванне свайго кантролю над суседнімі дзяржавамі, а на паслабленне сваіх палітычных канкурэнтаў. У 1399 г. Вітаўт вяртае ваенны патэнцыял дзяржавы ў знешнепалітычнае рэчышча, але паражэнне на Ворскле перапыняе яго на некаторы час. Увогуле, перыяд улады Вітаўта вызначаўся жорсткім кантролем феадальнага грамадства з боку манаршай улады і назапашваннем праблем уладкавання дзяржавы, звязаным з нявызначанасцю спадчыннасці вялікакняжацкага пасада ў ВКЛ і неакрэсленасцю уніі з Польскім каралеўствам.

Але ў 1430-я гг. назіраецца барацьба феадальных груповак за кантроль над вялікакняжацкай уладай, які дазваляў прымаць удзел у кіраванні дзяржавай, станоўча вырашаць уласнае маёмаснае становішча. Такі працэс быў уплывам унутрыпалітычнай сітуацыі, адносін паміж прадстаўнікамі феадальнага саслоўя, іх прававога становішча ў дзяржаве, стасункаў улады і зямель-прыслухаючыхся.

У літаратуры акрэсліліся саслоўны, рэлігійны і нацыянальны падыходы да характарыстыкі адносін паміж варагуючымі лагерамі. Адбываецца аслабленне вялікакняжацкай улады (легітымізацыя манарха праз выбары і зацвярджэнне польскім каралём), аб'яднаўчага цэнтра і, як следства, уздым цэнтрабежных сіл на перыферыі. З іншага боку, назіраецца ўздым актыўнасці розных станаў грамадства: арыстакратыі, набілітэту, мяшчан. Станаўленне канфесійнай цярплівасці, што вызначылася ва ўраўнанні вернікаў-хрысціян ВКЛ (Троцкі акт 1434 г.)[15]. Аўтары імкнуцца абагульніць працэсы, этапы крызісу вярхоўнай улады, адносіны ў грамадстве, знешнепалітычныя перамены ў рэгіёне. Але вынікі барацьбы 1430-1440-х гг. могуць быць вызначаны толькі адносна пэўных груп насельніцтва ці палітычных інстытутаў. Немагчыма абагульняць прававыя дасягненні і страты на агульнадзяржаўным узроўні.

Даследчыкі канца XIX - пачатку XX ст. лічылі падмуркам канфліктнай сітуацыі наступныя прычыны: прававую дыскрымінацыю праваслаўных феадалаў, а таксама нацыянальную дыскрымінацыю "рускага" насельніцтва ВКЛ[16]. Па-за разглядам гісторыкаў засталося прававое неўладкаванне ў дзяржаве пытання валодання зямлёй. Правы феадалаў адрозніваліся не толькі ў розных частках дзяржавы паміж катэгорыямі землеўладальнікаў, але і ў адных і тых жа трупах феадалаў адной зямлі: арыстакратаў і баяраў[17]. Ваенныя падзеі 1430-х гг. абмяжоўвалі вырашэнне прававога становішча феадалаў на зямлю. Таму нормаўладкаванне і уніфікацыя пачаліся толькі пры вялікім князі Казіміры, аформіліся праз судовыя выракі, што замацоўвалі наданні Свідрыгайлы і Жыгімонта асобным феадалам, і агульназемскім прывілеем 1447 г., выдадзеным "прелатам, княжатом, рытерем, шляхтичом, бояром, местичом нареченных земель" ВКЛ[18].

Аснову рухаючай сілы канфлікту 1430-1440-х гг. складалі феадалы. У землях прыслухаючых актывізаваліся таксама гараджане (Полацка, Смаленска і іншых гарадоў) і царкоўная іерархія (Луцкі і Полацкі ўладыкі)[19]. Пры гэтым барацьба за непасрэдны кантроль вялікакняжацкай улады ў 1430-я гг. праходзіла ўласна паміж пераважна арыстакратычнымі "партыямі" Свідрыгайлы і Жыгімонта, на

што звярталася ўвага яшчэ ў гістарычнай літаратуры пачатку XX ст., але гэта было забыта ў апошнія часы[20].

Тэрмін "барацьба", якім карысталіся сучаснікі падзей, на наш погляд, характарызуе перыяд 1430-1440-х гг. Унутрыпалітычная барацьба разгортвалася на некалькіх узроўнях і вызначалася як агульнай мэтай, так і шэрагам прыватных задач, для дасягнення якіх выкарыстоўваліся ўсе магчымыя сродкі (ад непасрэдных ваенных аперацый, паказальных жорсткіх пакаранняў да прывілеяў груп і асобных удзельнікаў падзей). Адзначым наступныя ўзроўні барацьбы: паміж прэтэндэнтамі на вялікакняскі пасад (Свідрыгайла - Жыгімонт, Казімір Ягелончык - Міхаіл Жыгімонтавіч); барацьба "партый" (руская, літоўская, польская); рэгіянальны канфлікт (землі - манарх; адносіны паміж асобнымі землямі); супрацьстаянне асоб. Мэты і інтарэсы нават унутры княжых партый не супадалі. Але непасрэдна можна вылучыць адну, да якой імкнулася грамадства ВКЛ у сярэдзіне XV ст., - вырашыць пытанне пра карыстанне зямлёй для арыстакратыі, баярства, мяшчан зямель-прыслухаючых. Ваенныя канфлікты 1430-х і 1440-х гг. былі справакаваны не без уплыву польскага боку, але знешнепалітычны фактар нельга лічыць вырашальным у палітычным становішчы ВКЛ.

1 Гл.: Lewicki A. Powstanie Swidrygietfy. Ustep z dziejow unii Litwy z Korona. Krakow, 1892.

2 Гл.: Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мн., 1972. Т. 1. С. 167-168; Шчарбакоў С.А. Свідрыгайлы паўстанне 1432-1439 // Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя: У 5 т. Мн., 1978. Т. 1. С. 642; Грыцкевіч А.П. Свідрыгайлы паўстанне 1432-1439 // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Мн.,2002. Т. 14. С. 256-257.

3 Archiwum ksiazat Lubartowiczow Sanguszkow w Slawucie. Lwow, 1887. T. I. S. 30-31.

4 Гл.: Kapystianki A. Ksiaze Michat Zygmuntowicz // Kwartalnik historyczny. 1906. S. 81-82.

5 Гл.: Дворниченко А.Ю., Кривошеее Ю.В. "Феодальные войны" или демократические альтернативы? // Вестн. С.-Петербург, ун-та. Сер. 2. 1992. Вып. 3. С. 3-12.

6 Гл.: Zakrzewski S. Bitwa nad Swieta., inaczej pod Witkomierzem, dnia 1 wrzesnia 1435 r. Lwow, 1935. S. 555.

7 Гл.: Zakrzewski S. Ibid. S. 556; Kapystiaiiki A. Op. cit. S. 88-92.

8 Гл.: Грыцкевіч А. Барацьба Вялікага княства Літоўскага і Рускага (Беларуска-Літоўскай дзяржавы) з Тэўтонскім ордэнам у канцы XIV - першай палове XV ст. // Адраджэнне. Гістарычны альманах. Мн., 1995. Вып. 1. С. 36-61; Лойка П.А. Палітычныя адносіны ў Вялікім княстве Літоўскім // Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1994. Ч. 1. С 114-139.

9 Гл.: Феодальная война в России во 2-й четверти 15 в. // Советская историческая энциклопедия: В 16 т. М., 1974. Т. 15. С. 43-46.

10 Гл.: Гражданская война // Философская энциклопедия: В 5 т. М., 1960. Т. 1. С. 401.

11 Гл.: Право войны // Брокгауз и Ефрон [Электрон, ресурс]: Энциклопедия на 6 CD. М., 2004. CD № 2.

12 Гл.: Акты, относящіеся къ исторіи Южной и Западной Россіи, собранные и изданные Археографическою коммиссіею. СПб., 1863. Т. 1. № 31. С. 21-22.

13 Гл.: Дворниченко А.Ю. Князь Свидригайло и западнорусские городские общины // Проблемы отечественной и всеобщей истории. Л., 1988. Вып. 11. С. 146-154.

14 Гл.: Гумилев Л.Н. Древняя Русь и Великая степь. М., 2000; Этногенез и биосфера Земли. М., 2001.

15 Гл.: Белоруссия в эпоху феодализма: В 3 т. Мн., 1959. Т. 1. С. 119-121.

16 Гл.: Вольдемаръ А. І. Національная борьба въ Великомъ Княжестве Литовскомъ въ XV и XVI векахъ // Известія отделенія русскаго языка и словесности императорской Академіи Наукъ 1909 г. СПб., 1910. Т. XIV. Кн. 3. С. 160-198.

17 Гл.: Любавскій М.К. О распределена владеній и объ отношеніях между великими и другими князьями Гедиминова рода въ XIV и XV вв. // Издания историческаго общества при Императорском Московском Университете. Рефераты читаные в 1895 году. М., 1896; Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI - першай трэці XVII ст. Мн., 2002.

18 Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. С. 125-126.

19 Гл.: Хорошкевич А.Л. Очерки социально-экономической истории Северной Белоруссии в XV веке: Автореф. дис. ... д-ра ист. наук. М., 1974; Дворниченко А.Ю. Русские земли ВКЛ: очерки истории общины, сословий государственности (до начала XVI в.). СПб., 1993.

20 Гл.: Грушевський М. Історія України-Руси (XIV-XVI віки - відносини політичні). Київ; Львів, 1907. Выд. 2. Т. 4; Вольдемаръ А.І. Указ. сач. С. 160-198; Nikodem J. Przyczyny zamordowania Zygmunta Kiejstutowicza // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. 2002. № 17. S. 5-33.

Паступіў у рэдакцыю 05.10.05.

***Андрэй Уладзіміравіч Любы*** - аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоў.